# Жывое палатно гісторыі

*(Заканчэнне. Пачатак у № 11)*



Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**У сучасных умовах Інстытут гісторыі НАН Беларусі актыўна развівае інавацыйны напрамак сваёй дзейнасці, падтрымлівае сувязь навукі з жыццём грамадства, папулярызуе гісторыка-культурную спадчыну беларускага народа. Даследаванні вучоных, многія з якіх не маюць аналагаў у айчыннай і замежнай гістарычнай навуцы, фарміруюць уласна беларускі погляд на гісторыю Беларусі, гістарычны светапогляд нашага народа, спрыяюць умацаванню беларускай дзяржаўнасці. Распрацоўка навуковых тэм ажыццяўляецца на прафесійнай аснове, мэтанакіравана і настойліва, з нацыянальна-дзяржаўных пазіцый.**

## Ад архіваў да найноўшых напрацовак

Са старажытных часоў і да сярэдзіны XX стагоддзя тэрыторыя Беларусі, якая знаходзіцца на геапалітычным перакрыжаванні, станавілася арэнай шматлікіх войнаў і ваенных канфліктаў. Таму прыярытэтным кірункам даследаванняў ваенных гісторыкаў інстытута на чале з А.М. Літвіным з'яўляецца сістэмная рэканструкцыя ваеннай гісторыі Беларусі. Вучонымі ўпершыню выяўлены і ахарактарызаваны комплекс айчынных і замежных дакументальных і гістарыяграфічных крыніц, якія адлюстроўваюць маштабы і ступень удзелу беларусаў і жыхароў Беларусі ў войнах і ваенных канфліктах XX стагоддзя. Гэта дало магчымасць, з аднаго боку, ацаніць ступень уплыву і ўклад нашых суайчыннікаў у развіццё і вынікі ваенна-гістарычных падзей, а з другога – устанавіць ступень уздзеяння ваенных катаклізмаў на гістарычнае развіццё беларускай дзяржаўнасці, нацыі і нацыянальнай ідэі, на месца і ролю Беларусі ў міждзяржаўных адносінах XX стагоддзя.

Вельмі важна тое, што ўпершыню выяўлены і занесены ў электронны банк даных імёны 10 938 беларусаў, выхадцаў з Беларусі, вайскоўцаў Беларускай ваеннай акругі і грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія прымалі ўдзел у лакальных войнах і ваенных канфліктах XX стагоддзя ў Еўропе, Азіі, Афрыцы і Лацінскай Амерыцы.

Калектывам вучоных на чале з М.К. Кошалевым, па сутнасці, адкрыты новы кірунак беларускай акадэмічнай гістарычнай навукі – даследаванне гісторыі краін Блізкага і Сярэдняга Усходу. Ажыццёўлены комплексны навуковы аналіз гістарычнага вопыту і перспектыў развіцця інтэграцыйных працэсаў у Еўропе і свеце, удзелу ў іх Беларусі. Адлюстравана эвалюцыя дзяржаўнасці і культуры нашай краіны ва ўмовах інтэграцыі. Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі праведзена комплекснае вывучэнне гісторыі фарміравання, сучаснага стану і перспектыў развіцця беларуска-малдаўскіх і беларуска-казахстанскіх палітычных, гандлёва-эканамічных, навуковых і культурных сувязей на мяжы XX–XXI стагоддзяў. Развіваюцца даследаванні па гісторыі беларускай дыяспары як неад'емнай часткі нашага народа. У гісторыка-метадалагічным плане несум-

### ПРА АЎТАРА

ДАНІЛОВІЧ Вячаслаў Віктаравіч.

Нарадзіўся ў 1973 годзе ў г. Полацку. Скончыў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка (1996), аспірантуру пры кафедры гісторыі Беларусі гэтага ж універсітэта (1999).

З 1999 па 2006 год працаваў асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі, начальнікам упраўлення падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі БДПУ. З 2006 года – намеснік дырэктара па навуковай рабоце, з 2011 года – дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Кандыдат гістарычных навук (2000), дацэнт (2005).

Аўтар амаль 120 навуковых публікацый, у тым ліку 11 манаграфій (10 у суаўтарстве), 3 навучальных (у суаўтарстве) і 6 вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

Сфера навуковых інтарэсаў: даследаванне нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гадах і маладзёжнага руху ў БССР у 1921–1939 гадах.

неннае дасягненне – вылучэнне і навукове абгрунтаванне прынцыпу неабходнасці максімальнага ўліку менавіта тых бакоў узаемадачыненняў, якія збліжалі краіны і народы, былі накіраваны не на канфрантацыю, а на пазітыўныя інтэграцыйныя фактары.

Навукоўцамі-гісторыкамі на чале з У.І. Кузьменкам і С.А. Трацціяком упершыню прааналізаваны тэарэтычныя і метадалагічныя аспекты агульнага і асаблівага ў фарміраванні сучаснай беларускай дзяржаўнасці, працэсе мадэрнізацыі Рэспублікі Беларусь; выдзелены асноўныя этапы станаўлення і развіцця асобных сфер культуры і сістэмы адукацыі. Выяўленне, абагульненне і аналіз новых дакументаў і матэрыялаў па гісторыі беларускай навукі і яе персаналій даюць магчымасць вырашаць актуальныя навуковыя задачы, ушчыльную падысці да правядзення комплексных навуковых даследаванняў. Вынікам мэтанакіраванай працы апошніх гадоў сталі падрыхтоўка і выданне М.У. Токаравым цыкла зборнікаў дакументаў і матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці прэзідэнтаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – У.М. Ігнатоўскага, П.В. Горына, К.В. Горава, В.Ф. Купрэвіча, зборніка дакументаў і матэрыялаў аб стварэнні і дзейнасці першай комплекснай навуковай установы нашай краіны – Інстытута беларускай культуры.

Трэба адзначыць і плённую працу супрацоўнікаў аддзела антрапалогіі і экалогіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, адзінага ў краіне навуковага цэнтра, што ажыццяўляе комплексныя даследаванні біялогіі чалавека. Антраполагамі інстытута на чале з Л.І. Цягака і В.У. Марфінай упершыню выяўлены асаблівасці біялагічнай і культурнай адаптацыі насельніцтва Беларусі да змен навакольнага асяроддзя, а таксама характэрныя рысы антрапалогіі старажытнага і сучаснага насельніцтва.

Вучонымі Інстытута гісторыі распрацаваны арыгінальныя навуковыя канцэпцыі экспазіцый Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, музеяў гісторыі НАН Беларусі, а таксама некаторых рэгіянальных музеяў. Пастаянна ажыццяўляецца супрацоўніцтва з шэрагам музеяў краіны па атрыбуцыі артэфактаў, якія знаходзяцца ў іх фондах, падрыхтоўцы музейных экспазіцый.

## Унікальныя выданні

Сёння варта ганарыцца фундаментальнымі працамі археолагаў, гісторыкаў і антраполагаў інстытута, арыгінальнымі навуковымі творамі. Цэлы шэраг выданняў, падрыхтаваных навукоўцамі Інстытута гісторыі, атрымалі прызнанне шырокай айчыннай і замежнай грамадскасці і не маюць аналагаў у свеце. Так, аўтарскім калектывам на чале з А.А. Каваленем створаны вучэбна-метадычны комплекс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» (Мінск, 2006–2009), які ўключае праграму, падручнік, даведнік, рабочы сшытак, хрэстаматыю, дапаможнік для настаўніка. Гэты комплекс прызнаны лепшым у краінах СНД.

Упершыню на аснове найноўшых дасягненняў гістарычнай думкі, канцэптуальных метадалагічных падыходаў, а таксама нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіі ў калектыўнай манаграфіі «Беларусь: Народ. Государство. Время» *[1]* прадстаўлена гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сучаснасці, раскрыты месца і роля беларускага народа ў развіцці еўрапейскай цывілізацыі. Выданне стала пераможцам у намінацыі «Лепшае масава-палітычнае выданне» Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі – 2010», а таксама атрымала Гран-пры Міжнароднага конкурсу «Навуковая кніга – 2010» у Маскве. Акрамя таго, на яго аснове выйшла разлічаная на шырокае кола чытачоў багата ілюстраваная кніга «Беларусь: страницы истории» *[2]*, дзе сцісла, але змястоўна прадстаўлена гісторыя Беларусі са старажытных часоў па 2010 год уключна.

Ва ўнікальнай двухтомнай калектыўнай манаграфіі «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.» *[3; 4]* упершыню ў сусветнай навуцы дадзена новая трактоўка дэфініцыі «дзяржаўнасць» і на гэтай аснове прадстаўлена канцэпцыя генезісу беларускай дзяржаўнасці.

Несумненным дасягненнем акадэмічных археолагаў стаў выхад у свет спецыялізаванай энцыклапедыі «Археалогія Беларусі» ў 2 тамах *[5; 6]*.

На высокім навуковым і інфарматыўным узроўні падае тысячагадовую шматгранную, багатую і адметную гісторыю нашай краіны яшчэ адно ўнікальнае выданне «Археологическое наследие Беларуси =



Archaeological Heritage of Belarus» *[7]*. Кожны археалагічны артэфакт у кнізе мае не толькі пэўную назву, але і ўвесь патрэбны навукова-даведачны апарат, з якога вынікае, што гэта за рэч, калі, кім і дзе яна была выяўлена. Выданне атрымала Гран-пры Міжнароднага конкурсу «Навуковая кніга – 2012» у Маскве.

У серыі «Древнейшие города Беларуси» выдадзена калектыўная манаграфія «Полоцк» *[8]*, якая раскрывае старонкі гісторыі найстаражытнага беларускага горада ў эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу, выразна дэманструе месца і значэнне Полацка ў гісторыі і культуры Беларусі і ўсёй Еўропы. Гэта кніга стала лаўрэатам Міжнароднага конкурсу «Навуковая кніга – 2013» у Маскве.

Супольным дасягненнем і плёнам творчага ўзаемадзеяння вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белкартаграфія», Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь і Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь стаў выпуск у свет 1-га і 2-га тамоў «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі» *[9; 10]*. Выдадзеныя тамы ахопліваюць перыяд ад з'яўлення чалавека на тэрыторыі Беларусі да 1795 года. Іх выхад у свет стаў падзеяй нацыянальнага маштабу, важкім крокам наперад не толькі ў развіцці гістарычнай картаграфіі, але і гістарычнай навукі ўвогуле. Цяпер вядзецца карпатлівая праца па падрыхтоўцы і выпуску 3-га і 4-га тамоў гэтага ўнікальнага выдання.

Трэба адзначыць, што ў акадэмічных гісторыкаў склалася плённае супрацоўніцтва з беларускімі архівістамі. Яго важкімі вынікамі сталі такія адметныя працы, як падрыхтаваны спецыяльна да 70-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР зборнік дакументаў і матэрыялаў «Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…» у 2 кнігах *[11; 12]* (змешчаны ўнікальныя архіўныя дакументы 1939–1956 гадоў, якія адлюстроўваюць падзеі ўз'яднання беларускага народа ў адзінай нацыянальнай дзяржаве, палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні), а таксама зборнік дакументаў і матэрыялаў «Польша – Беларусь. 1921–1953» *[13]*, дзе выразна раскрыта паланізатарская палітыка ўладных эліт Рэчы Паспалітай на тэрыторыі Беларусі і адпаведныя негатыўныя наступствы для беларускага народа.

## На інавацыйным шляху

Пры фінансавай падтрымцы Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь навукоўцамі інстытута выкананы шэраг інавацыйных праектаў. Так, у рамках дагавора з Міністэрствам культуры краіны ўпершыню вывучаны канструкцыйныя асаблівасці планіроўкі профілю рова і сцен бастыёнаў Нясвіжскага замка, на аснове якіх распрацаваны і рэалізаваны праекты іх рэканструкцыі па стану на XVI–XVII стагоддзі.

У рамках дагавора з Кіраўніцтвам справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь упершыню ў гістарычнай навуцы праведзены глыбокі гістарыяграфічны, крыніцазнаўчы, археалагічны і этнаграфічны аналіз праблем гісторыка-культурнай спадчыны Белавежскай пушчы. Выяўлены шэраг унікальных гістарычных, археалагічных і этнаграфічных матэрыялаў, выпрацаваны канкрэтныя рэкамендацыі па практычным выкарыстанні гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёна Белавежскай пушчы, якія сталі асновай для навуковай канцэпцыі і стварэння музея Нацыянальнага парку «Белавежская пушча», адкрытага восенню 2009 года. У яго экспазіцыі ўпершыню ў нашай краіне прадстаўлены не толькі прыродныя багацці прыродаахоўнай тэрыторыі, але і яе гісторыя. Аналагаў музею ў суседніх дзяржавах няма.

▼ **У час адкрыцця Археалагічнай навукова-музейнай экспазіцыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі . 1 лістапада 2007 года**



Спецыяльна да 600-годдзя пачатку фарміравання запаведнага рэжыму на тэрыторыі Белавежскай пушчы ўпершыню ў гістарычнай навуцы падрыхтаваны калектыўная манаграфія «Белавежская пушча: вытокі запаведнасці, гісторыя і сучаснасць» *[14]*, а таксама фотаальбом «Зямля сілы. Белавежская пушча» *[15; 16]*, у якім змешчаны рэдкія кадры фотахронікі, здымкі прадстаўнікоў флоры і фаўны і адлюстраваны важнейшыя гістарычныя падзеі на гэтай тэрыторыі ад старажытнасці да сучаснасці.

Атрыманыя вынікі навуковых даследаванняў былі агучаны на Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 600-годдзю ўвядзення запаведнага рэжыму ў Белавежскай пушчы «Белавежская пушча: гісторыя, прырода, турызм» у верасні 2009 года, арганізаванай сумесна з Кіраўніцтвам справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным паркам «Белавежская пушча», Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь, ЮНЕСКА.

Праект «Вывучыць гісторыка-культурную спадчыну Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» і выпрацаваць канкрэтныя рэкамендацыі па практычным выкарыстанні гэтай спадчыны» адзначаны дыпломам НАН Беларусі як адзін з лепшых інавацыйных праектаў.

Таксама ў рамках дагавора з Кіраўніцтвам справамі Прэзідэнта выкананы інавацыйны праект «Вывучыць гісторыка-культурную спадчыну Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» і выпрацаваць канкрэтныя рэкамендацыі па практычным выкарыстанні гэтай спадчыны». Знойдзеныя ўнікальныя гістарычныя, археалагічныя і этнаграфічныя матэрыялы гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёна сталі асновай для стварэння экспазіцыі новага музея Нацыянальнага парку «Прыпяцкі», адкрытага летам 2012 года. Таксама была выдадзена калектыўная манаграфія «Прыпяцкае Палессе: ад старажытнасці да сучаснасці» *[17]*.

У перспектыве плануецца ахапіць падобнымі праектамі ўсе нацыянальныя паркі нашай краіны і Бярэзінскі біясферны запаведнік.

## Замежнае супрацоўніцтва

Інстытут гісторыі імкнецца развіваць супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі. На сённяшні дзень мы маем устойлівыя сувязі з навуковымі цэнтрамі Расіі, Украіны, Польшчы, Францыі, Германіі.



▲ **Фрагмент экспазіцыі Музея прыроды Нацыянальнага парку «Белавежская пушча»**

Паколькі большая частка архіўных дакументаў і матэрыялаў па гісторыі нашай краіны знаходзіцца ў замежных архівах і бібліятэках, для працы з гэтымі крыніцамі, а таксама для прэзентацыі навуковых дасягненняў і абмену вопытам на міжнародным узроўні навукоўцамі інстытута выкарыстоўваюцца замежныя камандзіроўкі і стажыроўкі. Акрамя таго, у выніку такіх паездак дасягаюцца дамоўленасці аб рэалізацыі сумесных навуковых праектаў, падпісваюцца дагаворы і пагадненні. На сёння заключаны пагадненні аб супрацоўніцтве з 26 замежнымі і 25 айчыннымі ўстановамі і арганізацыямі. У выніку навукоўцы інстытута маюць магчымасць ажыццяўляць актуальныя для айчыннай гістарычнай навукі навуковыя праекты, працаваць з дакументамі па гісторыі Беларусі, якія знаходзяцца ў архівах і Беларусі, і іншых краін. Так, пры фінансавай падтрымцы германскага фонду «Памяць, адказнасць і будучыня» даследавана праблема прымусовай працы насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У грунтоўнай калектыўнай манаграфіі «Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі. 1941–1945 гг.» *[18]* упершыню на дакументальным матэрыяле абгрун-

таваны факт прыцягнення германскімі акупантамі да прымусовай працы амаль 2 млн жыхароў Беларусі.

Сапраўдным прарывам у гістарыяграфіі Беларусі, Расіі і Украіны стала падрыхтоўка і публікацыя калектыўнай манаграфіі, а таксама зборніка дакументаў і матэрыялаў «1941: Страна в огне» ў 2 кнігах *[19; 20]*, дзе прадстаўлена цэласная карціна падзей 1941 года, адпаведная бачанню гісторыкаў трох краін. У выданні змешчана вялікая колькасць найноўшых факталагічных і статыстычных даных, тэарэтычных абгрунтаванняў. Гэта першая пасля распаду СССР буйная міжнародная гістарычная праца аб пачатковым этапе Вялікай Айчыннай вайны.

У рамках сумеснага навуковага праекта «Краіна ў полымі. Расія і Беларусь у гады карэннага пералому, 1942–1943» навукоўцамі нашага інстытута і калегамі з Інстытута ўсеагульнай гісторыі РАН у 2011–2013 гадах быў праведзены параўнальны аналіз дакументаў савецкага і германскага паходжання, якія тычацца ацэнкі партызанскага руху ў Беларусі. Даследчыкі прыйшлі да высновы, што барацьба з акупантамі да канца 1943 годаператварылася ў масавы рух супраціўлення беларускага народа захопнікам. Партызанскі фронт у Беларусі стаў рэальным ваенна-стратэгічным фактарам карэннага пералому ў ходзе вайны ў цэлым. Цяпер па выніках праекта рыхтуюцца да выдання калектыўная манаграфія і зборнік дакументаў і матэрыялаў.

Спецыяльна да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў навукоўцамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі падрыхтаваны сумесна з калегамі з гістарычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М.В. Ламаносава зборнік успамінаў і навуковых артыкулаў «Республика-партизанка. К 70-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков» *[21]*, а сумесна з навукоўцамі Інстытута ваеннай гісторыі Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі – калектыўная манаграфія «Освобождение Беларуси. 1943–1944» *[22]*, у якой прадстаўлены найноўшыя напрацоўкі беларускіх і расійскіх гісторыкаў па дадзенай праблематыцы, а ў якасці дадатку змешчаны ўнікальныя архіўныя дакументы і матэрыялы, большасць з якіх апублікавана ўпершыню.

Па заказу і пры фінансавай падтрымцы Пінскага гарадскога выканаўчага камітэта на падставе дакументальных матэрыялаў айчынных і замежных архіваў спецыяльна да 945-годдзя Пінска выдадзена калектыўная манаграфія «Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці» *[23]*. А для Беларускай чыгункі на вялізным дакументальным матэрыяле са шматлікіх айчынных і замежных архіваў намі падрыхтавана калектыўная манаграфія «История Белорусской железной дороги. Из века XIX в век XXI» *[24]*. Гэта выданне атрымала дыплом у намінацыі «Залатыя скрыжалі» Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі – 2013».

Пры фінансавай падтрымцы Цэнтра напалеонаўскіх даследаванняў (Францыя) у 2012–2014 гадах пад кіраўніцтвам В.І. Кошмана ўпершыню паспяхова праведзена беларуска-французская археалагічная экспедыцыя на месцы пераправы войскаў Напалеона цераз раку Бярэзіну ў 1812 годзе. Праца гэтай экспедыцыі будзе працягвацца.

## Навука і жыццё грамадства

Інстытут гісторыі НАН Беларусі актыўна развівае інавацыйны напрамак сваёй дзейнасці, укараняючы вынікі навуковых даследаванняў у гістарычную адукацыю, папулярызуючы дасягненні гістарычнай навукі, прапагандуючы гісторыка-культурную спадчыну беларускага народа. З гэтай мэтай наладжаны трывалыя сувязі з установамі адукацыі, педагогамі, краязнаўцамі і насельніцтвам канкрэтных беларускіх рэгіёнаў. Дзейнасць вучоных-гісторыкаў накіроўваецца на сацыяльную інавацыйнасць, спалучэнне фундаментальных даследаванняў з практыкай, сувязь навукі з жыццём грамадства. Так, супрацоўнікі інстытута выкарыстоўваюць вынікі навуковых даследаванняў у час лекцый, семінараў, практычных заняткаў і практык амаль у 20 ВНУ краіны.

Сустрэчы вучоных-гісторыкаў з грамадскасцю, правядзенне навуковых канферэнцый, прысвечаных даследаванню мінулага асобных населеных пунктаў і рэгіёнаў нашай краіны, распачатыя па ініцыятыве Інстытута гісторыі НАН Беларусі, сталі добрай і карыснай традыцыяй. На гэтых навуковых мерапрыемствах узняты велізарны пласт раней невядомых дакументаў і ма-



▲ Удзельнікі V Міжнароднай летняй школы маладых вучоных-гісторыкаў краін СНД «Актуальныя праблемы Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў (да 65-годдзя Вялікай Перамогі)» . Мінск, 14–23 чэрвеня 2010 года

тэрыялаў, папулярызуецца мінулае і сённяшняе жыццё беларусаў. Такая форма навукова-асветнай работы атрымала шырокі грамадскі рэзананс і высокую ацэнку навуковай супольнасці. Правядзенне падобных мерапрыемстваў – непасрэдная практычная ідэалагічная работа, накіраваная на кансалідацыю беларускай нацыі, забеспячэнне гарманізацыі грамадскіх адносін, фарміраванне патрыятызму, грамадзянскай актыўнасці і адказнасці, захаванне культурна-гістарычнай пераемнасці і гістарычнай свядомасці. Гэта неабходна для ўмацавання духоўна-маральных і ідэалагічных асноў беларускага грамадства.

Паказальна, што партнёрамі інстытута пры правядзенні канферэнцый сталі аўтарытэтныя і ўплывовыя дзяржаўныя структуры, грамадскія арганізацыі, сярод якіх Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі, Беларуская праваслаўная царква, Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне «Белая Русь», Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, Міждзяржаўны фонд супрацоўніцтва дзяржаў – удзельніц СНД і інш.

Супрацоўнікі інстытута займаюцца прапагандай навуковых дасягненняў у галіне гісторыі, археалогіі і антрапалогіі, распаўсюджваннем навуковых ведаў. Пры гэтым выкарыстоўваюцца ўсе магчымыя сродкі інфармавання – лекцыі, канферэнцыі, друк, тэлебачанне і радыё.

Калектыў Інстытута гісторыі НАН Беларусі не спыняецца на дасягнутым: нам неабходна вырашыць шэраг актуальных задач. Так, для паспяховага вывучэння археалагічнай, зберажэння культурнай спадчыны беларускага народа, з мэтай мінімізацыі выдаткаў пры праектаванні і будаўніцтве народнагаспадарчых аб’ектаў, арганізацыі эфектыўнай аховы помнікаў археалогіі трэба стварыць «Археалагічную карту Беларусі» на падставе суцэльнага абследавання ўсёй тэрыторыі краіны з нанясеннем на карту ўсіх вядомых помнікаў археалогіі, іх зон аховы.

Безумоўна, самай сур’ёзнай увагі патрабуюць праблемы крыніцазнаўства. Вельмі актуальным з’яўляецца стварэнне трывалых асноў для маштабнай навукова-даследчай і арганізацыйнай работы па планамерным і сістэматычным выданні гістарычных дакументаў. У сувязі з гэтым прапрацоўваюцца варыянты рэалізацыі праграмы выдання крыніц па айчыннай гісторыі з адпаведным фінансаваннем, маг-

чыма праз Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь.

У лік крыніц для першачарговай публікацыі павінны ўвайсці старажытныя дакументы, што праліваюць святло на гісторыю Беларусі XIII – пачатку XVI стагоддзя, а таксама шматлікія земскія, гарадскія і магістрацкія кнігі XVI–XVIII стагоддзяў, якія захоўваюць у сабе велізарны матэрыял па сацыяльнай, эканамічнай, палітычнай гісторыі нашай айчыны, дзейнасці цэнтральных і мясцовых органаў улады і кіравання, гістарычнай геаграфіі, генеалогіі баярскіх, мяшчанскіх і нават сялянскіх родаў. Неабходна прадоўжыць працу па выданні кніг Метрыкі ВКЛ, звесткі якіх маюць неацэннае значэнне для гісторыі Беларусі. На рэгулярную і сістэматычную аснову павінна быць пастаўлена справа па выданні крыніц па новай і найноўшай гісторыі Беларусі.

Разам з калегамі з ВНУ плануем падрыхтаваць шматтомную гісторыю Беларусі, у якой на аснове новых канцэптуальных і метадалагічных распрацовак гістарычнай навукі, а таксама нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіі Рэспублікі Беларусь будуць абагульнены важнейшыя працэсы і падзеі айчыннай гісторыі, сучасныя дасягненні нашай краіны. Гэта праца будзе своеасаблівай нарматыўнай базай пры падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для навучальных устаноў, навуковым «компасам» пры далейшай распрацоўцы недаследаваных або малавывучаных праблем беларускай гісторыі.

Увогуле плануецца падрыхтоўка і выданне комплексу фундаментальных аб'ектыўных навуковых работ па нацыянальнай гісторыі, якія сфарміруюць навуковую базу для ўдасканалення і абнаўлення праграм, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для вышэйшых, сярэдніх і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, будуць спрыяць развіццю ў падрастаючага пакалення і грамадства ў цэлым разумення багацця беларускай гісторыі і культуры, пачуцця патрыятызму і гонару за свой народ і краіну.

Дзейнасць Інстытута гісторыі НАН Беларусі сёння накіравана на вызначэнне перспектыўных напрамкаў беларускай гістарычнай навукі, паглыбленне аб'ектыўных навуковых ведаў пра мінулае, прапаганду і папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны, захаванне культурна-гістарычнай пераемнасці. Навукова-практычная праца вучоных інстытута ўносіць значны ўклад ва ўмацаванне беларускай дзяржаўнасці, прэстыжу краіны на міжнародным узроўні, у патрыятычнае і духоўна-культурнае выхаванне моладзі, развіццё турыстычнага патэнцыялу Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Беларусь: Народ. Государство. Время. – Минск: Беларуская навука, 2009. – 879 с.
2. Беларусь: страницы истории. – Минск: Беларуская навука, 2011. – 408 с.
3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.: у 2 кн. – Кн. 1. – Мінск: Беларуская навука, 2011. – 584 с.
4. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.: у 2 кн. – Кн. 2. – Мінск: Беларуская навука, 2012. – 654 с.
5. Археалогія Беларусі: энцыклапедыя: у 2 т. – Т. 1. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2009. – 496 с.
6. Археалогія Беларусі: энцыклапедыя: у 2 т. – Т. 2. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2011. – 464 с.
7. Археологическое наследие Беларуси = Archaeological Heritage of Belarus. – Минск: Беларуская навука, 2012. – 192 с.
8. Полоцк. – Минск: Беларуская навука, 2012. – 743 с.
9. Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. – Т. 1. – Мінск: Белкартаграфія. – 2009. – 245 с.
10. Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. – Т. 2. – Мінск: Белкартаграфія, 2013. – 347 с.
11. «Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…». Верасень 1939 г. – 1956 г.: дакументы і матэрыялы: у 2 кн. – Кн. 1: Верасень 1939 г. – 1941 г. / склад.: У.І. Адамушка [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 340 с.
12. «Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…». Верасень 1939 г. – 1956 г.: дакументы і матэрыялы: у 2 кн. – Кн. 2: Ліпень 1944 г. – 1956 г. / склад.: У.І. Адамушка [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 301 с.
13. Польша – Беларусь (1921–1953): сб. документов и материалов / сост. А.Н. Вабищевич [и др.].– Минск: Беларуская навука, 2012. – 423 с.
14. Белавежская пушча: вытокі запаведнасці, гісторыя і сучаснасць. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 455 с.
15. Зямля сілы. Белавежская пушча = Земля силы. Беловежская пуща. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2009. – 600 с.
16. Зямля сілы. Белавежская пушча = The Earth forces. A Belovezhsky dense forest. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2009. – 600 с.
17. Прыпяцкае Палессе: ад старажытнасці да сучаснасці: гісторыя рэгіёна Нацыянальнага парка «Прыпяцкі». – Брэст: Альтернатива, 2013. – 264 с.
18. Літвін, А.М. Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі. 1941–1945 гг. / А.М. Літвін, Я.А. Грэбень, С.Я. Новікаў; агул. рэд. А.М. Літвіна / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі НАН Беларусі; Фонд «Памяць, адказнасць і будучыня» (Берлін). – Мінск: Тэсей, 2010. – 584 с.
19. 1941 год: страна в огне: в 2 кн. – Кн. 1: Очерки. – М.: ОЛМА Медиа Групп, 2011. – 720 с.
20. 1941 год: страна в огне: в 2 кн. – Кн. 2: Документы и материалы. – М.: ОЛМА Медиа Групп, 2011. – 720 с.
21. Республика-партизанка. К 70-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков. – М.: Из-во НО «Ассоциация «Лига содействия оборонным предприятиям», 2014. – 360 с.
22. Освобождение Беларуси. 1943–1944. – Минск: Беларуская навука, 2014. – 943 с.
23. Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці: да 915-й гадавіны з першага летапіснага ўпамінання / [А.М. Літвін і інш.]; Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Вышэйшая школа, 2012. – 711 с.
24. История Белорусской железной дороги. Из века XIX – в век XXI – Минск: Мастацкая літаратура, 2012. – 955 с.